# КНІЖНЫЯ СКАРБНІЦЫ

Савецкія людзі любяць чытаць кнігі. Нашы бібліятэкі наведваюць сотні тысяч чытачоў — рабочыя, калгаснікі, служачыя, інтэлігенцыя, вучнёўская моладзь. Густая бібліятэчная сетка дапамагае задавальняць растучую патрэбнасць мас у ведах, шырыць іх гарызонт.

За годы сталінскіх пяцігодак Савецкая Беларусь узбагацілася сапраўднымі палацамі кніг. Вось Дзяржаўная бібліятэка ім. В. І. Леніна. Гэта бібліятэка ўладае багацейшым кніжным фондам.

Бібліятэка абслугоўвае не толькі чытачоў горада Мінска, але абласных і раённых бібліятэк рэспублікі праз спецыяльна створаны для гэтай мэты аддзел — міжбібліятэчны абанемент.

Арганізацыя міжбібліятэчнага абанемента з'яўляецца вельмі важнай справай. Патрэбнасці шырокіх мас працоўных у кнізе настолькі рознастайны, што большасць бібліятэк не мае магчымасці іх поўнасцю задаволіць. Аддзел міжбібліятэчнага абанемента дае магчымасць найбольш рацыянальна выкарыстоўваць кожную кнігу. Ён з года ў год пашырае сваю работу. Калі ў 1932 годзе іншагародным чытачам было паслана толькі 320 кніг, то ў 1939 годзе — больш 7.000 кніг.

Міжбібліятэчны абанемент абслугоўвае больш 300 пунктаў у абласцях і раёнах БССР. Яго паслугамі карыстаюцца бібліятэкі гарадоў брацкіх рэспублік — Орджанікідзе, Саратава, Сталіно, Ленінабада і іншых.

Штодзённа ў міжбібліятэчны абанемент паступаюць з розных канцоў Савецкай Беларусі заяўкі чытачоў з просьбай выслаць ім адпаведную літаратуру.

Агранам Брагінскага раёна вывучае пытанне селекцыі, яму неабходна навуковая літаратура. Выкладчыку Гомельскага педінстытута патрэбна літаратура па методыцы і педагогіцы і т. д. Гэтыя кнігі чытачы атрымліваюць праз аддзел міжбібліятэчнага абанемента.

Настаўніца брагінскай школы (Палеская вобласць) тав. Кулініч піша дырэкцыі бібліятэкі: «З'яўляюся чытачом бібліятэкі каля 5 год. Прачытала многа кніг, якіх у сябе не дастала. Яны дапамагаюць мне вучыцца завочна, займацца самаадукацыяй...»

Цесную сувязь з аддзелам міжбібліятэчнага абанемента трымаюць чытачы Шылко (брыгадзір трактарнай брыгады), Глушанін (Дзідзілаўская школа, Бягомльскага раёна) і многія іншыя. Ім высылаецца неабходная літаратура.

Міжбібліятэчны абанемент дае магчымасць партыйнаму, комсамольскаму, савецкаму, прафсаюзнаму і калгаснаму актыву, настаўнікам, аграномам, інжынерна-тэхнічным і навуковым работнікам на месцы атрымаць літаратуру, патрэбную для павышэння палітычнага, агульнаадукацыйнага і тэхнічнага ўзроўню. Бібліятэка мае багацейшы кніжны фонд і аказвае вялікую дапамогу бібліятэкам Беларусі ў справе лепшага абслугоўвання чытачоў такой літаратурай, якой часам не бывае на месцы. Бібліятэка атрымлівае новыя кнігі, рэдкія выданні з раду гарадоў Саюза. Яна звязана з 110 бібліятэкамі — Масквы, Ленінграда, Кіева, Харкава, Одэсы, Тбілісі і іншых гарадоў.

Міжбібліятэчным абанементам павінны карыстацца шырокія масы працоўных усіх куткоў рэспублікі. У гэтым вялікую ініцыятыву павінны праявіць кіраўнікі абласных бібліятэк, мясцовыя партыйна-комсамольскія арганізацыі.

**М. АЎСКЕР,**
**загадчык аддзела міжбібліятэчнага абанемента Дзяржаўнай бібліятэкі БССР ім. В. І. Леніна.**